***Анастасія Гулак***

## ДА ПЫТАННЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ АБРАДНАСЦІ ВАДЖЭННЯ І ПАХАВАННЯ СТРАЛЫ

Прынятая ў навуцы назва адной з унікальных з'яў традыцыйнай абраднасці Усходняга Палесся – *ваджэнне / пахаванне стралы* [2, с.231]. Менавіта пад такой назвай абрад, зафіксаваны ў вёсцы Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на, Гомельскай вобл., у 2007 г. уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (катэгорыя Б)[1].

Сёння абрад прыцягвае ўвагу навукоўцаў і дзеячоў культуры[2]. Вялікія канцэптуальныя здабыткі і значны аб'ём палявога матэрыялу па тэме «стралы» дазваляюць зрабіць высновы аб яго сістэматычным даследаванні.Акрэслены зоны бытавання абраду–сярэдняе Падняпроўе і басейны рэк Сож і Дзясна, г. зн. тэрыторыя паўднёва-усходняй Беларусі, заходняй Браншчыны і паўночна-усходняй Украіны [3, с. 64]. Своеасаблівым эпіцэнтрам яго лічыцца Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Назіраецца значнае вар'іраванне назваў ва ўсім рэгіёне бытавання: с*трала / стряла / сула / вадзіць стралу /вадзіць сулу / вадзіць вясну / Ушэсце / Узнясенне Гасподне / сена / ёлка / ганяць старцоў* і іншае. Вярбальную структуру абраду складае шматразовае выкананне карагоднай песні *Як пушчу стралу*(зона пашырэння песні большая, за зону бытавання абраду).

Менавіта з адзінкавых публікацый асноўнай «стрэльнай»песні ў першай палове XIX ст. пачынаецца гістарыяграфія гэтай з'явы ў славянскай фалькларыстыцы.Першыя запісы песніпахавання стралы зрабіў З. Даленга-Хадакоўскі ўрэгіёне Падолля і Валыніў 1814–1819 гг. [11, с. 514–515]. У 1855 г. у зборніку ўкраінскіх песень А. Мятлінскага апублікаваны адзін тэкст. З канца XIX ст. народная традыцыя шырока адлюстроўваецца ў нарадазнаўчых працах. У 1888 г. З. Радчанцы ў зборніку «Гомельскія народныя песні (беларускія і маларускія)» змяшчае вельмі цікавы сюжэт з сямейна-бытавым матывам канцоўкі «жонка плача па мужу да абеду, а па абедзе выходзіць у танок і выбірае новага мужа», зафіксаваны ў Гомельскім павеце [8, с. 39–40]. З. Радчанка належыць адно з першых натаванняў «стрэльнай» песні («Зборнік маларускіх і беларускіх песень Магілёўскай губерні», 1911). У працы У. Дабравольскага «Смаленскі этнаграфічны зборнік» (1903) тры тэксты са Смаленшчыны, абазначаны як «плач маці, сястры і жонкі па молайцу» [4, с. 122–123]. Цікавасць для даследавання эвалюцыі абрадавай песні ўяўляе адзін варыянт, у якім да асноўнага сюжэту далучаны баладны матыў «тры ластаўкі ля забітага малойчыка» і народна-хрысціянскія вобразы ў фінале *Паняслі цела ў царковачку: // Самі дзверычкі расчыніліся, // Самі званы зазваніліся, // Самі свечы зацяпліліся, // Цела белае схаранілася.*У 1912 г. Е.Раманаў у Вып. 8 «Беларускага зборніка»прыводзіць фрагментарныя звесткі пра абрад і песні [9, с. 178].

Ажыўленне краязнаўчай і фальклорна-этнаграфічнай працы ў 1920-я гг. актуалізуе збіранне многіх унікальных з'яў народнай абрадавай культуры. У 1926 г. у штомесячніку «Наш край» Інбелкульта з'яўляецца кароткі нарыс карэспандэнта М. Каршукова, у якім абрад, зафіксаваны ў в. Стаўбун, называецца «заключным актам усяго веснавога цыклу звычаяў і песень» [6, с. 41]. Публікацыя М. Каршукова заканчвае першы этап гістарыяграфіі абраду, для якога характэрны пераважна апісальны характар.

Другі этап – канцэптуальны – пачынаецца з 1960-х гг. У гэты час ідзе распрацоўкапраблем генезісу, міфасемантыкіі структуры абраду, жанравай эвалюцыі іэтнафоніі абрадавых песень. Спынімся на некаторых найбольш значных публікацыях. У 1978 г. Л. Салавей аналізуе асноўную «стрэльную» песню ў кантэксце «напрамку і характару змен абрадавай песні на шляху яе да ліра-эпічнай балады, не звязанай з абрадавым дзеяннем» [10, с. 91]. Абрадавая/заклінальная песня з матывам «стралы», лічыцьаўтар, мае найперш засцерагальную семантыку. (Наяўнасць у некаторых варыянтах імператыва «забіць добра молайца» з'яўляецца, на думку Л. Салавей, дэфектам, абумоўленым паступовай стратай або скажэннем абрадавай функцыі песеннага твора). Пазней «цэнтральнае месца ў ёй заняла старажытная, гранічна адшліфаваная формула параўнання пачуццяў блізкіх, якая вельмі адпавядала радавой ідэалогіі, ідэалогіі матрыярхату, а потым атрымала вузейшае, толькі сямейнае гучанне» [10, с. 94]. Вельмі цікавым з'яўляецца тэзіс Л. Салавей аб тым, што архаічны сюжэт галоўнай «стрэльнай» песні стаў асновай класічнага баладнага матыву «тры птушачкі ля забітага малойчыка» [10, с. 90].

Першым у кантэксце этнамузыкалогіі песні гэтага абраду разгледзеў В. Ялатаў. Напрыклад, ім ахарактарызаваны распеты варыянт карагода «Страла»: метрычная пераменнасць 6/4, 5/4, несіметрычна растаўленыя ферматы пры захаванні асноўнай метрычнай формулы, захаванасць тыповай страфічнай формы (ABRB) [12, с. 58].

---

[1]Закон Рэспублікі Ббеларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь", Арт. 16. П. 4.2.: катэгорыя «Б» – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова адноўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці якіх аб'ектыўна з часам могуць змяняцца.

[2]Гл: Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Жывая спадчына Беларусі", даступна на: http://livingheritage.by/nks/location/885/?LOCATION_ID=885&PAGEN_1=2; Відэафільмы: «Як пушчу стралу», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2008 г.; «Адраджэнне абраду "Ваджэнне і пахаванне стралы"»,дак. фільм, рэж. Аляксандр Карпаў, 2011 і іншае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўныя канцэптуальныя здабыткі ў вывучэнні абраду пахавання стралы былі зроблены ў 1980–1990-я гг. на матэрыяле экспедыцый Маскоўскай кансерваторыі і Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР пад кіраўніцтвам М.І. Талстога. Значны ўклад у фонд фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў па страле сабраны Г.А. Барташэвіч падчас экспедыцый Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.У манаграфіі Г. Барташэвіч (1985) уведзены ў навуковы зварот каштоўныя палявыя матэрыялы. Лакалізацыягэтага ўнікальнагаабрадавага комплексу, паводле Г. Барташэвіч, супадае з вобласцю рассялення *радзімічаў*, часткова *дрыгавічоў і вяцічаў*. Даследчыца канстатуе сюжэтную ўстойлівасць песень «стралы» як у межах беларускай этнічнай традыцыі, так і ў традыцыі рускай і ўкраінскай, пры гэтым адзначае варыятыўнасць хранатопу абраду. У пытанні генезісу абраду пахавання стралы Г. Барташэвіч прытрымліваецца тэорыі «асноўнага міфа» В. Іванова і В. Тапарова. Асобна падкрэсліваецца семантыка *Перуна* як бога княжаскай дружыны, што, на думку даследчыцы, знаходзіць адлюстраванне ў галоўным прадметным увасабленні – страле і ў некаторых акцыянальных аспектах [1, с. 131].

Даследаванне В. Гусева(1986) у многім перадвызначыла кірунак далейшага тэарэтычнага асэнсавання абраду. У скарачэнні матэрыял В. Гусева ўключаны ў том БНТ «Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі» (1990). Аўтарсуаднасіць пахаванне стралы з вяснова-летнімі рытуаламіславян з акцыянальным матывам пахавання сімвалічных фігур (*Ярылы, Кастрамы, кукушкі*). Галоўным кампанентам міфасемантыкі вызначае аграрную магію, у якой узаемазвязаны прадукавальная і ахоўная магія [3, с. 73]. Галоўным унёскам В. Гусева ў распрацоўку «стрэльнай» праблематыкі ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы з'яўляецца этнасеміятычны ракурс разгляду абраду.

У 2005 г. Р.Кавалёва ставіць задачу «інтэрпрэтацыі паэтычных тэкстаў, усведамлення іх глыбіннай сувязі з абрадамі і адпаведным міфалагічным кантэкстам» [5, с. 84]. Яна дае вельмі арыгінальную трактоўку «стралы» як міфалагемы, што знаходзіцца на перакрыжаванні ідэй і матываў двух сусветных міфаў: пра свяшчэнны шлюб зямлі і неба і пра змаганне Грамаўніка з ворагам-змеем. Таксама ўказваецца, што семантыка стралы ў беларускім фальклоры мае не толькі міфалагічную прыроду, але і ўвасабляе сямейна-шлюбную прагматыку: вобразы «сватанне-паляванне» і «стрэлы кахання».

Лакальна-рэгіянальнаму вывучэнню абраднасці пахавання стралы прысвечана даследаванне В.С. Новак (2002), у якім тэарэтычнае асэнсаванне семантыкі асобных абрадавых дзеянняў абапіраецца на значны эмпірычны матэрыял. Ідучы ў рэчышчы этнасеміятычнага вывучэння гэтай абрадавай з'явы, закладзенага В. Гусевым, даследчыца выяўляе яе лакальную спецыфіку на ўсіх узроўнях (час і месца правядзення, структура, склад удзельнікаў, семантыка рытуальных дзеянняў, атрыбутыка) [7, с. 82–87].

У Т. 6 навуковага выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», прысвечаным культуры Гомельскага (Усходняга) Палесся і Падняпроўя (2012), друкуюцца новыя палявыя матэрыялы ваджэння / пахавання стралы, сабраныя вядомым краязнаўцам і фалькларыстам Г. Лапаціным, навукоўцамі І. Смірновай, А. Боганевай пераважна ў Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці.

Сёння даследчыкі плённа пашыраюць эмпірычную і тэарэтычную базу вывучэння гэтай унікальнай абрадавай з'явы. А значыць, гістарыяграфія абраду ваджэння / пахавання стралы развіваецца.

**Спіс літаратуры:**


1. Барташэвіч, Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 184 с.
2. Валодзіна, Т. В. Ваджэнне і пахаванне стралы / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак, І. Ю. Смірнова // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн., кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]. – Мінск : Вышэйш. шк., 2012. – С. 231–235.
3. Гусев, В. Е. Вождение «стрелы» («сулы») в Восточном Полесье / В. Е. Гусев // Славянский и балканский фольклор: Духовная культура Полесья на общеславянском фоне / отв. ред. Н. И. Толстой. – М. : Наука, 1986. – С. 63–75.
4. Добровольский, В. Н. Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. – СПб. : Тип. А. В. Васильева, 1903. – XVI, 720 с.
5. Кавалёва, Р. М. Песні абраду ваджэння і пахавання "стралы" ў сусветным міфалагічным кантэксце / Р. М. Кавалёва // Абрысы рытуальна-магічнай сферы беларускага фальклору : зб. арт. – Мінск : Бестпрынт, 2005. – С. 84–93.
6. Каршукоў, М. Пахаванне стралы / М. Каршукоў // Наш край. – Менск, 1926. – № 1. – С. 41–42.
7. Новак, В. С. «Пахаванне стралы» – рэгіянальна адметная абрадавая з'ява фальклору Усходняга Палесся / В. С. Новак // Абраднасць і паэзія пахавання Стралы. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2002. – С. 29–87.
8. Радченко, З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские) / З. Радченко. – СПб. : Тип. В. Безобразова и Комп., 1988. – XLIII, 265 с.
9. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильна : Тип. А .Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт беларуса. — VIII, 600 с.
10. Салавей, Л. М. Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 192 с.
11. Українські народні пісні у записах Зоріана Доленги-Ходаковського / Акад. наук Української РСР. – Київ : Наукова думка, 1974. – 781 с.
12. Ялатаў, В. І. Музыка беларускіх веснавых песень / В. І. Ялатаў // Веснавыя песні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – С. 36–72.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ